*Часопіс “Мастацтва”*
***№ 12 (321) 01.12.2009 - 31.12.2009 года.***
***Таццяна Катовіч***
***Адрэдагавана Тадэвушам Кокштысам***

# НЯСЦЕРПНАЯ ВАБНАСЦЬ БЫЦЦЯ



Вечар нядзелі быў насычаны справамі арганізацыйнымі. У акцёрскім фае накрывалі святочны стол, рыхтаваліся выйсці на сцэну з шампанскім і кветкамі, віншаваць з юбілеем народнага артыста Беларусі Тадэвуша Кокштыса. Жыццё вяло свой звычайны танец...

Над сцэнай і глядзельнай залай несліся словы яго героя, апошнія ў спектаклі «Кракаўскі студэнт». Тадэвуш Кокштыс — Іосіф ІІІ, арцыбіскуп Полацкі, бласлаўляў отрака Францішка ў дарогу, звяртаючыся да нас скрозь стагоддзі і падзеі... Вымаўляў словы прыгожыя, годныя. Тым больш што любоў да месца і тых блізкіх і вельмі дарагіх яму людей у сталага акцёра, які шмат чаго пабачыў, надзвычайная.

– З вайны, з акупацыі, з дзіцячых хвароб я ледзь-ледзь вылез, бадай што толькі на тыф не хварэў. Быў слабы, кволы. Калі з майго хутарка сям’я ішла працаваць у поле, касіць, жаць, — мне так хацелася быць з імі, але я ляжаў каля хаты ў цяньку...

Падчас акупацыі пайшоў у першы клас. Школа была аднапавярховая, драўляная. Эльстэр – дырэктар, я яго памятаю...

Цяжка давалася вучоба, радаваўся званку на перапынак ці ў канцы заняткаў. Часам увогуле збягаў з урокаў, і з такімі ж, як сам, сядзім пад мастком, ловім сліжыкаў... Чуем зверху тупат каваных нямецкіх ботаў. Маўчым. Рачулка маленькая і рыбка маленькая. І гэта нашы маленькія, трывожныя радасці.

Пасля вызвалення толькі адна дзяўчынка з чацвёртага класа перайшла ў пяты, а ўсе астатнія засталіся на другі год. Дарэчы, я і потым хадзіў з класа ў клас, уперад і назад, толькі ў 54-м годзе скончыў сярэднюю беларускую школу ў Валожыне.

Пасля выпускных экзаменаў дырэктар Антон Станіслававіч Паныш паклікаў у свой кабінет і ўручыў мне аб’яву аб прыёме ў тэатральна-мастацкі інстытут. «Вось, – паказвае, – мастацкі факультэт, а ты ж у нас мастак...» Сапраўды аднойчы на школьнай лінейцы «За актыўную грамадскую работу» мне аб’явілі падзяку і далі прэмію. Класная Марыя Фрыдрыхаўна сказала: «Вось табе сто рублёў, язджай дадому, няхай маці табе боцікі купіць...»

Пры паступленні ў інстытут сакратар пытаецца: «Якія ў вас з сабой работы? Якога фармату і ў якой тэхніцы?» Я не мог уцяміць, пра што гаворка. «Вы, – кажа, – напэўна, не зразумелі, куды паступаеце?» Заплакаў і перапісаў заяву... на акцёрскі.

Службовая даведка аб дзейнасці і творчых дасягненнях вядучага майстра сцэны, народнага артыста Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР Тадэвуша Кокштыса – нібыта «інфармацыя для роздуму»: «Высокі прафесіяналізм, працавітасць, карпатлівая работа над сабой дазволілі акцёру заняць вядучае становішча ў коласаўскай трупе». Насамрэч, ён ніколі не быў абмежаваны рамкамі амплуа. Аб’ёмна, быццам з гліны, вылепліваў вобразы Расплюева (адметнага сухаво-кабылінскага персанажа), коласаўскага Жабрака, гогалеўскага Качкарова і шэкспіраўскага Блазна, Графа з «Любоўнага карагода» Шніцлера і Зганарэля з «Лекара мімаволі» Мальера. Ён іранізуе, бывае, кпіць са сваіх герояў – і шкадуе іх адначасова.

Вочы Тадэвуша Кокштыса штораз змяняюцца ад саркастычна-зласлівых да гарэзліва-дзіцячых; вусны то падобныя на трагічную тэатральную маску, то смешна крывяцца ад лагоднасці і наіўнасці. Ва ўсім абліччы – энергія вечнага артыстызму, юнацкая неўтаймаванасць, ненатоленасць духоўнай смагі. Вучыў Тадэвуша Кокштыса слынны майстра Дзмітрый Аляксеевіч Арлоў, сам выдатны артыст.

– Я застаў сваю бабулю ў Валожыне. Маленькая, кволая, працавітая. Я запомніў яе Евангелле, заўсёды разгорнутае, а там – літары вялікія... Разам з бабуляй паклалі ў дамавіну гэтую цудоўную кнігу. Хацеў пакінуць яе на памяць, але не рашыўся... Бацька Антон Антонавіч расказваў, што іхні дзед – з-пад Дзвінска, значыць, з латышоў. Сям’я бацькавага брата Аўгустына пасля вайны апынулася ў Польшчы, і ён казаў, што яны палякі. Жартаўнік быў! Бацька наш

многае ўмеў. І майстар быў на ўсе рукі! А яшчэ цудоўна маляваў і займаўся фатаграфіяй. І таксама жартаўлівы быў, камічны! Мая сястра Аліна ўсё жыццё выкладала ў мастацкай школе ў Брэсце. Яна і яе сыны – прафесійныя мастакі. Выстаўляюцца дома і за мяжой.

Наша маці Анастасія Міхайлаўна і яе сёстры Маня і Паша былі слынныя краўчыні. Прафесар з Вільні ім уручаў дыпломы. А якая цёця Маня гарэзлівая была!.. Як яе на ўсё хапала? Нават спявала ў царкоўным хоры... Дарэчы, наша мама таксама запрашалася спяваць у царкве, але ўжо ў Хоўхле. А цётка Маня... О! На бяседзе – такія анекдоты расказвала! А прыпеўкі!..

Я з дзяцінства не ўмеў раставарацца ў асяроддзі, пазбягаў кампаній. Затое калі гучала музыка, песні на вечарынцы ці на вяселлі з удзелам самадзейных музыкаў, або на ўсю ваколіцу разлівалася галасістае жаночае жніво... Дарагія да слёз вобразы дзяцінства засталіся ў сэрцы на ўсё жыццё. Ад такіх, як мае родныя, ад дзівакоў-сялян я набіраў для будучага сцэнічнага жыцця.

А калі ўдавалася штосьці ўвасобіць з ваеннага, – сяржанта ў той жа «Плошчы Перамогі», – не трэба было мне падкідваць ніякіх рэжысёрскіх вабікаў, у мяне столькі іх у сэрцы, што толькі адкрывай. І я выходжу са сваёй вайной: яна для мяне жывая, памятаю яе, мне ўжо дзесяты годзік быў, – сам як у «Апошніх сведках» Святланы Алексіевіч.

Усведамленне перажытага знаходзіць выйсце праз ролю, праз сцэну. Пры незайздроснай знешнасці, відаць, Бог надарыў здольнасцю наталяць душу акаляючым светам. Я шчаслівы, калі мне ўдаецца паглыбіць свае сцэнічныя вобразы сваім, назапашаным.

Гастрыта з дудараўскага «Вечара» акцёры звычайна іграюць з асалодай. Характарная роля дае магчымасць для стварэння шматграннага вобраза, гістарычнае поле якога вядзе за небакрай па любой выбранай выканаўцам сцяжынцы. Дваццатае стагоддзе шмат нарадзіла такіх вертухаеў і даносчыкаў з іх зайздрасцю, з комплексамі і напалеонаўскімі марамі. Тадэвуш Кокштыс іграў у «Вечары» разам з Яўгенам Шыпілам і Таццянай Мархель (а таксама з Валянцінай Петрачковай). Ягоны Гастрыт быў Фядосу і Ганне чужы па крыві – нібы з іншай культурай і традыцыяй. У ім прысутнічаў нейкі бляск, уся ягоная постаць распавядала пра іншы сацыяльны слой. І ён падаваўся надзвычай адзінокім, тады як Фядос і Ганна – кожны сам па сабе – адзінокімі не былі. І Гастрыт усё не мог усвядоміць, чаму так сталася. І справа тут была не ў ягонай зласлівасці і недарэчным жыцці, а якраз

наадварот. Прычыну і вынік Кокштыс мяняў месцамі, балючы нерв Гастрытавай нянавісці да ўсяго свету палягаў у інакшасці персанажа. Фядос і Ганна валодалі ўсёй паўнатой быцця як асобы самадастатковыя, карэнныя, тутэйшай культурай народжаныя і ёю прасякнутыя. Натура Гастрыта мела іншы пачатак, больш аналітычны, уедлівы і цікаўны. Ён здаваўся напружана-парадаксальным і тонкім. З гэтага ж шэрагу былі Райнер з «Сола для гадзінніка з боем» Освальда Заградніка, Тарас з «Тараса на Парнасе» Сяргея Кавалёва, доктар Эстэрмарк з «Бацькі» Аўгуста Стрындберга.

Чароўнымі і спагадлівымі ягоныя дзядкі і дзядзькі не бываюць. Нават калі яны смешныя і нагадваюць клоўнаў. Нават калі іх недарэчнасць чаплінаўскага кшталту, як, напрыклад, у «Лекары мімаволі». Персанажы Тадэвуша Кокштыса наскрозь драматычныя, больш за тое, раптам мільгане і гамлетаўскае вывіхнутае стагоддзем вар'яцтва. Невырашальнае пытанне, неспакой і нейкае восеньскае трымценне жыцця. Як у пейзажы за акном ягонай грымёркі – з Кіраўскім мостам, чырвона-зялёнымі светлафорамі і свінцовай Дзвіной, якая цячэ так, нібыта сплывае час... Прыхаваная шторкамі характарнасці і камедыйнасці вострая драма дапытлівага чалавека заўсёды рэзка, быццам нож, прарэзвае ролю. І тут узнікае пытанне катарсісу. Для Кокштыса яно не з апошніх у акцёрскім жыцці.

Кожны, хто вывучаў тэарэтычныя дысцыпліны ў вышэйшай мастацкай установе, памятае, што катарсіс – гэта не проста выплеск жывога і яркага пачуцця, але і фактператварэння негатыўных эмоцый у пазітыўныя. І звязана гэта не толькі з псіхікай і не толькі з эстэтыкай, а больш за ўсё – з мараллю і духоўным светам. У акцёрскім пераўтварэнні ўзнікае вобраз, які з'яўляецца носьбітам часткова самастойнай свядомасці. Гэты вобраз пранізвае акцёра наскрозь і трансфармуе яго біяполе.

У працятай сярэбранымі ніцямі-струнамі сцэнічнай прасторы спектакля «Прывітанне, Альберт!» ад каласнікоў да планшэта кругам па цэнтры ўзнікаюць вобразы-здані з падсвядомасці Альберта Эйнштэйна. Скрыпічны гук, шызы колер... Музыка і бясконцыя словы... Успаміны і бясконцыя спрэчкі... Маленькі яблык выпадае з далоняў Ньютана — Тадэвуша Кокштыса. Сэр Ісаак біўся над формулай быцця з не меншай апантанасцю, чым Альберт. Стары Ньютан смяяўся са старога Альберта на сцэне. А між тым абодва былі запрошаны на Боскую вячэру... Камедыя? Драма? Жыццё ў мастацтве, дзе магчыма дасягаць завершанасці ў незавершаных сімфоніях.